

Славіна ГАЎРЫЛАВА

# КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ ПОЛАЦКА – ад вытокаў да сучаснасці

## *(да 90-годдзя з дня заснавання)*

*Краязнаўчы музей Полацка з'яўляецца адным са старэйшых дзеючых музеяў Беларусі. У снежні 2016 года музей адзначае 90 гадоў з дня адкрыцця першай экспазіцыі. За гэты час ён прайшоў шлях ад галоўнага музея рэгіёна (павета, акругі, вобласці, раёна) да цэнтральнага музея горада з уласнымі аддзеламі-філіяламі.*

Да юбілейнай даты Краязнаўчы музей Полацка падышоў з назапашаным вопытам збіральніцкай, экспазіцыйнай, асветніцкай дзейнасці і патрэбай у яго пераасэнсаванні, што немагчыма без ведання тых гістарычных умоў, у якіх гэты вопыт фарміраваўся. Па гэтай прычыне нам падаецца актуальным правядзенне даследавання, па выніках якога ўпершыню будзе прадстаўлена цэласная гісторыя музея ад яго вытокаў да сучаснасці.

На сённяшні дзень нам вядома некалькі дзясяткаў публікацый, прысвечаных дзейнасці Полацкага краязнаўчага музея. Пераважна гэта публікацыі яго супрацоўнікаў розных перыядаў: С.Мялешкі, П.Агурка, М.Казлёнка, В.Купрыянава, Г.Хановіч[1] і інш. У іх апісваюцца тэматычная структура экспазіцыі, прадстаўленыя ў ёй экспанаты, розныя накірункі дзейнасці музея адпаведнага часу і г. д. Даследаванню гісторыі стварэння і станаўлення музея прысвечаны навуковыя публікацыі Т.А.Джумантаевай[2], В.Д.Краско, Н.А.Сяргеенка, Н.У.Жук, у якіх даволі падрабязна разгледжаны даваенны перыяд развіцця музея.

### Ад ідэі да рэалізацыі

Многія краязнаўчыя музеі Беларусі былі створаныя на аснове прыватных збораў ці папярэдніх музеяў розных устаноў. Аднак краязнаўчы музей у Полацку адкрыўся толькі пасля шматгадовага працэсу назапашвання музейных прадметаў, бо калекцыі існаваўшых у горадзе ў XVIII—XIX стст. музеяў езуіцкага калегіума (пазней — акадэміі), піярскага вучылішча, кадэцкага корпуса, Педагагічнага музея наглядных дапаможнікаў і Музея розных прадметаў лясной гаспадаркі былі разрабаваныя альбо вывезеныя ў іншыя гарады — Віцебск, Санкт-Пецярбург, Маскву, Вільню, Варшаву. Таму першачарговай задачай да стварэння музея стала фарміраванне яго фондаў. У выніку пра-



***ГАЎРЫЛАВА Славіна Вячаславаўна.***

*Вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, суіскальнік вучонай ступені Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Нарадзілася ў Полацку. У 2003 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2015 г. прайшла перападрыхтоўку ў Інстытуце культуры Беларусі па спецыяльнасці "Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці". З 2007 г. працуе ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку. Даследуе гісторыю Полацка XX ст., гісторыю музейнай справы. Аўтар больш за 10 навуковых публікацый.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэс арганізацыі Полацкага краязнаўчага музея зацягнуўся і прайшоў некалькі этапаў. Першы з іх быў непасрэдна звязаны з дзейнасцю аддзела народнай адукацыі Полацкага павятовага выканкама, другі — Полацкай павятовай камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, трэці — Полацкага акруговага краязнаўчага таварыства.

Справа па стварэнні музея пачалася пасля падпісання Саветам народных камісараў РСФСР 5 кастрычніка 1918 г. дэкрэта аб уліку, рэгістрацыі і ахове помнікаў мастацтва і даўніны, паводле якога ў павятовых гарадах РСФСР (у склад якой у той час уваходзіў і Полацкі павет) павінны былі стварацца мясцовыя музеі. Полацкі павятовы аддзел народнай адукацыі прыняў рашэнне стварыць музей пры Доме народнай асветы з мэтай арганізацыі агульнадаступнага пазашкольнага выхавання і адукацыі. У Полацку, які на той час быў павятовым цэнтрам, і валасцях павета праводзіліся рэгістрацыя помнікаў даўніны і мастацтва, перапіс прадметаў мастацтва ў дамах і маёнтках заможных палачан, быў арганізаваны прыём мастацкіх каштоўнасцяў ад прыватных асоб "за ўзнагароду". Для музея з розных мясцін павета былі прывезеныя *"коллекция птиц (600 экз.), коллекция орудий каменного века (до 110 экз.), 3 зуба мамонта, несколько окаменелостей и др. предметов означенной коллекции"*[3]. У выніку замест прыродна-гістарычнага музея, як планавалася аддзелам народнай адукацыі, было вырашана адкрыць музей старажытнасцяў і сучаснай культуры.

Да стварэння музея былі прыцягнуты мясцовыя настаўнікі школ П.М.Пяроўскі і А.С.Еленеў. Апошні ўзначаліў музейна-выставачна-экскурсійную секцыю пры пазашкольным аддзеле Полацкага аддзела народнай адукацыі. Парфірый Міхайлавіч Пяроўскі ў запісцы ў аддзел народнай адукацыі прапанаваў сваё бачанне будучага музея: *"На первых порах своего существования музей мне представляется выставкой предметов из разных областей знания и искусства, из разных мест. По мере пополнения коллекций, тому или иному региону будут посвящены отдельные полки, затем шкафы, затем этаж и т.д. В конце концов, сильно разросшийся универсальный музей может быть развернут на несколько универсальных музеев, хотя не исключается возможность существования одного обширного музея универсального характера наподобие Московского политехнического. Не исключается возможность закупки экспонатов на рынке. Некоторые предметы не откажутся отдать частные лица. Большую помощь могут оказать местные школы. Предполагается следующий штат: заведующий и 2-3 инструктора по специальностям: история с археологией. Естествознание с географией и, может быть, искусство; сторож и организатор посещений"*[4].

Напачатку быў распрацаваны каштарыс на набыццё музейных прадметаў і экспазіцыйнага абсталявання, аднак неўзабаве ўзніклі цяжкасці з памяшканнем для размяшчэння музея: будынак у цэнтры горада, у якім планавалася размясціць музей, быў перададзены вайскоўцам, а Сафійскі сабор, які таксама разглядаўся як варыянт для размяшчэння музея, быў вернуты праваслаўнай абшчыне.

Другі этап арганізацыі музея быў звязаны з прыцягненнем да гэтай справы грамадскасці. У 1920 г., з разгортваннем краязнаўчага руху ў РСФСР, у Полацку ўзнік гурток аматараў вывучэння роднага края, арганізатарамі якога былі полацкія настаўнікі П.Пяроўскі, А.Еленеў, а таксама П.Дэйніс. Сябры гуртка ставілі перад сабой мэту аб'ядноўваць "культурныя сілы" ў вывучэнні і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны Полаччыны і стварыць у Полацку музей. Яны распрацавалі праект будучага музея. Аднак гэты праект аддзел народнай адукацыі прызнаў несвоечасовым, бо ён рэпрэзентаваў мінулае замест сацыялістычнай сучаснасці, і яго адхілілі. У хуткім часе на аснове гэтага і іншых гурткоў аматараў гісторыі паводле адпаведнага распараджэння губвыканкама была створана Камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, якую ўзначаліў Пётр Восіпавіч Дэйніс. Перад ёй стаяла задача не толькі займацца ўлікам, рэгістрацыяй і аховай помнікаў, але і арганізаваць у Полацку народны музей з гісторыка-археалагічным, прыродна-гістарычным і рэвалюцыйным аддзеламі, а таксама аддзелам наглядных дапаможнікаў. Пры музеі планавалася арганізаваць хіміка-фатаграфічную лабараторыю, аўдыторыі са светлавымі карцінамі, метэаралагічную станцыю і майстэрні. Да справы падышлі дастаткова прафесійна, пра што сведчыць фармулёўка першачарговай задачы: *"формирование музейного фонда: нахождение соответствующего помещения, срочное приведение в порядок существующих уже предметов и их аккуратная инвентаризация"*[5].

У канцы 1924 г. у сувязі з адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі зменамі (Полацкі павет быў далучаны да БССР) Камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва спыніла сваю дзейнасць — у выніку стварэнне музея апынулася пад пагрозай. Аднак гэтую справу працягнулі члены Полацкага краязнаўчага таварыства, створанага ў снежні таго ж года. Пасяджэнні гісторыка-археалагічнай секцыі таварыства праходзілі ў памяшканні Першай савецкай школы, дзе захоўваўся фонд будучага музея. Збіраць для будучага музея экспанаты дапамагалі больш за чатыры сотні сяброў раённых краязнаўчых таварыстваў, якія выяўлялі і дасылалі ў Полацк каштоўныя знаходкі. Такім чынам, на апошнім (трэцім) этапе стварэнне музея ў гэтай справе прымалі ўдзел полацкая інтэлігенцыя, а таксама краязнаўцы і аматары гісторыі з усяго рэгіёна. Аднак па-ранейшаму рэалізацыя гэтай задумы залежала ад прыхільнага стаўлення да яе мясцовых уладаў.

У ліпені 1926 г. пастановай СНК БССР быў перададзены пад музей будынак Полацкага Сафійскага сабора. Падчас рамонту будынка была музеефікаваная старажытная муроўка сабора з фрагментамі фрэскавага роспісу. 25 снежня 1926 г. мясцовая га-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА.

**Апавяшчэньне.**

У нядзелю 26 сьнежня. 1926 г., у 12 гадзін з поўдні адбудзецца урачыстае адчыненьне Полацкага Акруговага Краязнаўчага Музэю ў памяшканьні, вядомага гістарычнага помніка, бышага Сафійскага Сабору пры удзеле ўсіх дэлегатаў 2-ой акруговай краязнаўчай канфэрэнцыі і прадстаўнікоў партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафэсыянальных, вайсковых і іншых арганізацый.

Пасьля урачыстай часткі т. С. Мялешка зробіць даклад на тэму: «Гісторыя Полацкага Акруговага Краязнаўчага Музэю, яго мэты і задачы».

На адчыненьне Музэю запрашаюцца: усе сябры партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і краязнаўчых арганізацый.

Уваход па сяброўскім білетам.

За Старшыню Праўленьня
Акр. Краязн. Т-ва САНКЕВІЧ.

Адказны Сэкратар
Праўленьня Акр. Краязн. Т-ва С. МЯЛЕШКА.

*Абвяшчэнне аб адкрыцці Полацкага акруговага краязнаўчага музея ў газеце "Чырвоная Полаччына". 25 снежня 1926 г.*

зета "Чырвоная Полаччына" змясціла аб'яву пра адкрыццё музея, якое планавалася правесці на наступны дзень у рамках Другой акруговай краязнаўчай канферэнцыі. 26 снежня 1926 г. Полацкі акруговы краязнаўчы музей пачаў сваю працу*.

Першым дырэктарам музея стаў Сямён Максімавіч Брэскі**, які займаў гэтую пасаду да 1928 г.[6]. Напачатку музей меў наступныя аддзелы: вайсковы, гістарычны, мастацкі, а таксама аддзелы нумізматыкі, іканапісу, ручной работы, палеаграфіі і рэвалюцыйнага руху. У экспазіцыі можна было ўбачыць уніяцкія абразы XVIII—XIX стст., партрэты дзеячаў дамініканскага ордэна і рымскіх пап, карціну Сальватора Розы "Забойства пакутніка Стэфана", слуцкі пояс і іншыя рарытэты. Пры музеі дзейнічала невялікая бібліятэка, у якой меліся кірылічныя і лацінскія старадрукі XVI ст. У планах было адкрыць этнаграфічны, грамадска-эканамічны аддзелы і аддзел мясцовай прыроды[7].

У Сафійскім саборы краязнаўчы музей месціўся нядоўга. Ужо ў 1927 г. яго перавялі ў будынак былой лютэранскай кірхі, пабудаванай у 1888 г. У 1929 г. была змененая структура экспазіцыі музея. Яна набыла наступны выгляд: культурна-гістарычны аддзел з пададдзеламі (мастацкі, нумізматычны, вайсковы, археалагічны, старажытнага друку, рэвалюцыйнага руху і савецкага будаўніцтва на Полаччыне), прыродна-геаграфічны і грамадска-эканамічны аддзелы. Апошні па сутнасці выконваў ролю этнаграфічнай залы, дзе экспанаваліся прадметы матэрыяльнай культуры сялян Полацкага рэгіёна. Азнаёміцца з экспазіцыяй музея можна было толькі тры дні на тыдзень з 10 да 16 гадзін.

У 1930-я гг. надышоў самы цьмяны перыяд у гісторыі музея. Звестак пра яго дзейнасць захавалася мала. Музей займаў адну невялікую залу і меў маленькі службовы пакой. Яго экспазіцыя не задавальняла гарадскія ўлады, і ў верасні 1937 г. была арганізавана спецыяльная камісія, якая пасля наведвання музея пастанавіла яго часова закрыць для абнаўлення экспазіцыі. У снежні 1938 г. музей адкрыўся зноў[8].

На жаль, на пачатку Вялікай Айчыннай вайны калекцыі музея не былі эвакуяваныя, і за гады акупацыі іх амаль поўнасцю разрабавалі: ад музейнага збору засталося толькі 462 прадметы. На 1944 гг. яго фонды размяшчаліся ў двух пакоях у будынку Сафійскага сабора (плошчай 35 м$^2$).

### Адраджэнне музея

Да пытання пра аднаўленне ў Полацку гісторыка-краязнаўчага музея абласныя ўлады звярнуліся толькі ў пачатку 1946 г. Прапаноўвалася перадаць музею так званы Домік Пятра I — помнік архітэктуры канца XVII ст., у якім на той час жылі работнікі абласной канторы сувязі. Але ад гэтай ідэі неўзабаве адмовіліся. Для размяшчэння музея вырашылі перадаць будынак Сафійскага сабора. Полацкім аблвыканкамам было прынята рашэнне распачаць складанне праектаў рамонта сабора і арганізацыі ў ім музея. Заяву вернікаў аб выкарыстанні Сафійскага сабора для набажэнстваў адхілілі[9].

У верасні 1948 г. было абвешчана афіцыйнае адкрыццё музея. Аднак пастаяннай экспазіцыі ў яго яшчэ не было: яе планавалася падрыхтаваць да 30-годдзя БССР. У вызначаны час адкрыць экспазіцыю не ўдалося, была арганізаваная толькі фотавыстава "30 лет Советской Белоруссии"[10].

* За ўсю гісторыю свайго існавання музей некалькі разоў мяняў статус, што было выклікана адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі зменамі: у 1926—1938 гг. — акруговы, 1938—1944 гг. — раённы, 1944—1954 гг. — абласны, з 1954 г. — гарадскі.

** На сённяшні дзень вядомыя імёны амаль усіх дырэктараў музея: Галіна Цімафееўна Дзідзенка (гады працы: ?—1936 г.), Вера Аляксееўна Карэліна (1936—1937 гг.), Васіль Аляксандравіч Гаціх (1947—1953 гг.), Пётр Аляксандравіч Агурок (1953—1955 гг.), Мікалай Міронавіч Казлёнак (1956—1976 гг.), Эмануіл Міхайлавіч Хазін (1977—1985 гг.). З 1985 г. існавала пасада загадчыка музея: Эмануіл Міхайлавіч Хазін (1985—1995 гг.), Вольга Давыдаўна Краско (1995—2007 гг.), Ірына Пятроўна Воднева (з 2007 г. па гэты час).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Падчас працы над стварэннем экспазіцыі супрацоўнікі музея — дырэктар В.А.Гаціх і загадчык гаспадаркай В.М.Саўкін — рыхтавалі перасоўныя выставы на актуальныя для таго часу тэмы ("Сталинская Конституция — Конституция победившего социализма", "Творцы советской агробиологии" і інш.), наведвалі з імі розныя арганізацыі раёна і афіцыйныя мерапрыемствы часта ў суправаджэнні лектараў абласнога лекцыйнага бюро. У гэты час ішло і актыўнае камплектаванне фондаў музея: узорамі прадукцыі полацкіх прадпрыемстваў, дыяграмамі росту ўраджайнасці калгасаў вобласці, разнастайнымі макетамі тэхнікі, якія ў абавязковым парадку перадавалі музею мясцовыя прадпрыемствы і калгасы. Некаторыя прадметы для музея закупаліся. Заўважым, што ва ўсіх тагачасных краязнаўчых музеях камплектаванне фондаў праводзілася ў адпаведнасці з адзінай структурай экспазіцыі. Перавага ў экспазіцыйным паказе аддавалася перыяду сацыялістычнага будаўніцтва, таму ў музейныя зборы паступалі розныя мадэлі, макеты, дыяграмы, дакументы і фотадакументы, а таксама творы мастацтва адпаведнай тэматыкі.

Летам 1949 г. Полацкі абласны краязнаўчы музей быў гатовы прыняць першых наведвальнікаў у Сафійскім саборы. У яго экспазіцыі былі прадстаўлены шматлікія археалагічныя матэрыялы: косткі мамантa, каменныя сякеры, старажытная зброя, манеты XVIII—XX стст. і г. д. Экспазіцыю музея ўпрыгожвала



*Будынак Полацкага краязнаўчага музея.*
Фота канца 1960-х гг.

і некалькі карцін В.М.Васняцова. Вялікая колькасць экспанатаў распавядала пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны: узоры трафейнай і самаробнай зброі партызан, фотаздымкі байцоў і афіцэраў Чырвонай арміі (ураджэнцаў Полаччыны, а таксама тых, хто вызначыўся падчас яе вызвалення ад акупацыі), карціны "Салют Радзімы" В.Б.Эльконіна, "Пераможаны Берлін" Ф.М.Бараноўскага[11].

Восенню 1950 г. музею вярнулі будынак лютэранскай кірхі, у якім з 1944 г. працаваў кінатэатр. Будынак патрабаваў рамонту, які распачалі ў наступным годзе. Пасля атрымання памяшкання перад супрацоўнікамі музея паўстала задача стварэння новай экспазіцыі. У яе вырашэнні дапамагалі супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Так, у жніўні 1951 г. у Полацк былі дасланыя экспазіцыйныя планы раздзелаў "Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі", "Грамадзянская вайна" і частка плана па тэме "Вялікая Айчынная вайна"[12]. У маі 1952 г. быў адкрыты для наведвання раздзел "Пасляваеннае сацыялістычнае будаўніцтва", дзе на плошчы 145 м² размяшчалася 640 экспанатаў.

Камплектаванне фондаў музея ішло не толькі сіламі яго супрацоўнікаў, прадметы паступалі з іншых музеяў і гарадоў. Так, Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.Суворава перадаў прадметы часоў вайны 1812 г., з Масквы прывезлі археалагічныя знаходкі Л.В.Аляксеева з раскопак у ваколіцах Браслава. Самым каштоўным набыткам таго часу лічыцца меч X ст., знойдзены падчас будаўніцтва полацкага завода шкловалакна.

За Полацкім краязнаўчым музеем была замацаваная група раёнаў, у якіх музей праводзіў асветніцкую дзейнасць. Яна ўключала акрамя Полацкага Ветрынскі, Дрысенскі, Асвейскі, Ушацкі і Расонскі раёны[13].

Экспазіцыя тагачаснага музея размяшчалася ў некалькіх залах. На ўваходзе ў музей быў размешчаны стэнд "Полацк будуецца", матэрыялы якога (фотапанарама горада, здымкі адноўленых і новых адміністрацыйных і жылых будынкаў і інш.) прадстаўлялі дасягненні перыяду пасляваеннага аднаўленчага дзесяцігоддзя. У аддзеле прыроды экспанаваліся ўзоры раслін, карта глеб Полаччыны, партрэт вядомага савецкага селекцыянера І.У.Мічурына і муляжы садавіны "мічурынскіх гатункаў", акліматызаваных у мясцовых умовах. Пра прыродныя багацці края расказвалася ў яго раздзелах "Птушкі", "Рыба", "Жывёла", дзе былі сабраныя чучалы, прылады рыбнага лову, макет камбінаванага падлёднага лову. Экспанаты аддзела гісторыі распавядалі пра ўдзел беларускага народа і палачан у "агульнарускай барацьбе супраць іншаземных захопнікаў" (бітвы на р. Няве, Чудскім возеры, Куліковым полі). Падзеям Айчыннай вайны 1812 г. на Полаччыне быў прысвечаны асобны аддзел музея, дзе былі сабраныя матэрыялы пра *"зверствы французаў на рускай зямлі, гераічныя бітвы рускіх воінаў з напалеонаўскімі захопнікамі"*, партызанскую барацьбу супраць захоп-






*Фрагменты экспазіцыі музея.*
Фота 1970-х гг.

нікаў: рэпрадукцыі карцін мастака-баталіста П.Хеса, партрэт Я.П.Кульнева, схемы адступлення напалеонаўскай арміі ад Масквы, літаграфіі бітваў, ядры і кулі, воінскія мундзіры і галаўныя ўборы XIX ст. У аддзеле "Вялікая Айчынная вайна 1941—45 гг." былі прадстаўленыя стэнды з матэрыяламі пра абарону Брэсцкай крэпасці, разгром гітлераўцаў пад Масквой, Сталінградам і інш.; вялікая колькасць экспанатаў знаходзілася ў раздзеле, прысвечаным партызанскаму руху: баявая зброя партызан Полаччыны, улёткі, фатаграфіі кіраўнікоў партызанскіх атрадаў, абсталяванне падпольнай друкарні Полацкага райкама партыі, нумары мясцовай газеты "Большэвіцкі шлях"[14].

У 1950-я гг. фонды музея актыўна папаўняліся, ішла праца над стварэннем новых і пашырэннем існуючых аддзелаў. Так, у 1957 г. быў значна пашыраны аддзел гісторыі, які дапоўнілі матэрыялы эпохі першабытна-абшчыннага ладу (каменныя прылады працы эпохі неаліту, знойдзеныя на тэрыторыі Полаччыны, археалагічныя карты, схемы і іншыя матэрыялы з археалагічных раскопак), перыяду Полацкага княства (карта Полацкай зямлі, схема старажытнай часткі Полацка і шляху "з варагаў у грэкі", фотакопіі першых гандлёвых грамат і дамоў, акварэлі, на якіх былі адлюстраваныя помнікі старажытнага дойлідства — Сафійскі сабор і Спаская царква, Барысаў камень, літаграфія Крыжа Еўфрасінні Полацкай, а таксама прадметы матэрыяльнай культуры, знойдзеныя пры раскопках гарадзішчаў і курганоў XI—XII стст. на Полаччыне, зброя дружыннікаў XII і XIII стст. і інш.). У аддзеле прыроды з'явіліся дзве дыярамы ландшафтаў Полаччыны: "Змешаны лес" і "Луг і поле". У 1956 г. быў адкрыты новы пададдзел "Полаччына ў XIII—XVIII стст.", у якім знайшлі адлюстраванне Грунвальдская бітва 1410 г., жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны (яго партрэт, фотакопіі старонак скарынаўскіх кніг, мадэль друкарскага станка XVI ст. і інш.) і Сімяона Полацкага, падзеі Лівонскай вайны (акварэль "Вал Івана Грознага", макет Полацка XVI ст.), падзелы Рэчы Паспалітай, памятныя мяс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



ціны горада (фрагменты муроўкі будынкаў Кадэцкага корпуса, акварэль з відам на Домік Пятра І)[15]. Многія акварэлі і рэпрадукцыі былі падрыхтаваныя для музея мастаком-афарміцелем К.І.Маеўскім.

Каб актывізаваць працу музея і прыцягнуць да гэтага мясцовую грамадскасць, Полацкі гарвыканкам зацвердзіў савет музея, старшынёй якога быў прызначаны дырэктар музея М.М.Казлёнак. Членамі савета былі П.А.Агурок (навуковы супрацоўнік музея), М.В.Кундалевіч (загадчык фондаў), З.Х.Ілліна (загадчык аддзела прапаганды гаркама партыі), І.А.Сухарукаў (інспектар гарана), Л.І.Барановіч (загадчык аддзела культуры), І.П.Дэйніс (старшыня пастаяннай культурна-асветніцкай камісіі гарвыканкама), а таксама настаўнікі школ і выкладчыкі мясцовых тэхнікумаў[16]. Гарадскія ўлады ў мэтах арганізацыі даступнага наведвання краязнаўчага музея абвясцілі з 1 лютага 1956 г. уваход бясплатным[17], але працягвалася гэта нядоўга, бо з ліпеня таго ж года быў распачаты рамонт музейнага будынка. Хутчэй за ўсё, у той час была праведзена маштабная рэканструкцыя былой кірхі: быў надбудаваны другі паверх. Гэта дало магчымасць пашырыць экспазіцыйную плошчу музея. Толькі праз тры гады, пасля праверкі спецыяльнай экспертнай камісіі, у музеі быў адкрыты новы аддзел — гісторыі савецкага часу.

У пачатку 1960-х гг. фонды музея налічвалі больш за сем тысяч прадметаў, пры гэтым амаль трэцюю частку складалі прадметы асноўнага (2639 адзінак) і дзве трэці — навукова-дапаможнага фонду (4564 адзінкі). Найбольш калекцыі музея папоўніліся ў юбілейны для горада год — 1962 г., калі Полацк святкаваў 1100-годдзе першай летапіснай згадкі: 1354 музейныя прадметы, з якіх 397 увайшлі ў склад асноўнага фонду[18]. Вялікую калекцыю мясцовых археалагічных знаходак (250 адзінак) перадалі ў музей у 1963 г. археолагі М.К.Каргер і Г.В.Штыхаў.



*Фрагменты экспазіцыі музея.*
Фота 2010-х гг.

Чарговы рамонт, які заняў восем месяцаў, пачаўся ў кастрычніку 1964 г. Тады, верагодна, да му-

РЕПОЗИТОРИЙ

зея была зробленая прыбудова. Зноў супрацоўнікі музея звярнуліся да практыкі стварэння перасоўных выстаў, якія вазілі па горадзе і раёне. Экспазіцыя музея, адкрытая ў 1967 г. да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, канчаткова набыла класічную для музеяў краязнаўчага профілю структуру. Яна складалася з трох аддзелаў: гісторыі Полаччыны дасавецкага перыяду, гісторыі савецкага грамадства і прыроды краю. Два першыя згаданыя аддзелы займалі аднолькавую плошчу — 105 м$^2$ (аддзел прыроды — 20 м$^2$), і такія суадносіны "гістарычнага мінулага" і "савецкай рэчаіснасці", калі рэпрэзентацыя некалькіх савецкіх дзесяцігоддзяў значна пераўзыходзіла паказ стагоддзяў дасавецкай гісторыі, з'яўляліся характэрнымі для ўсіх краязнаўчых музеяў СССР.

## Краязнаўчы музей — цэнтральны музей горада

Згодна з пастановай Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Савета Міністраў Беларускай ССР № 318 ад 19 верасня 1967 г. "Аб стане і мерах па паляпшэнні аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў Беларускай ССР" Верхні і Ніжні замкі ў Полацку ў комплексе з Сафійскім саборам былі аб'яўленыя гісторыка-археалагічным запаведнікам, які стаў філіялам краязнаўчага музея, а той, у сваю чаргу, — філіялам Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. З таго часу калектыў музея працаваў над развіццём філіяльнай сеткі. Так, у 1971 г. на левым беразе Заходняй Дзвіны, у парку імя 50-годдзя савецкай улады, недалёка ад Кургана Бессмяротнасці, у спецыяльна пабудаваных памяшканнях быў адкрыты Музей баявой славы, экспазіцыя якога прысвячалася падзеям Вялікай Айчыннай вайны на Полаччыне. Праз дзесяць гадоў, у 1981 г., у будынку Богаяўленскага сабора, помніку архітэктуры XVIII ст., адкрылася Полацкая гарадская карцінная галерэя[19].

У 1974 г. у музеі быў наладжаны улік наяўных прадметаў і новых паступленняў, уведзены афіцыйныя ўліковыя дакументы: былі заведзеныя кніга паступленняў (галоўная інвентарная кніга), спецыяльная інвентарная кніга па ўліку вырабаў з каштоўных металаў (манет, узнагарод, плакет): кніга навукова-дапаможнага фонду, інвентарная кніга абменнага фонду і інш. (усяго 11 кніг); у музеі з'явіліся прадметная, тэматычная і алфавітная картатэкі; пачалося складанне навуковых пашпартоў. Да матэрыялаў фондаў Полацкага краязнаўчага музея ў сваёй даследчай дзейнасці звярталіся навучэнцы школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкі, навукоўцы, рэдактары выдавецтваў і журналісты мясцовых, рэспубліканскіх і ўсесаюзных СМІ, краязнаўцы, супрацоўнікі іншых музеяў і г. д. Фондавыя калекцыі размяшчаліся ў прыбудове да асноўнага будынка плошчай 38,8 м$^2$, абсталяванне якога, як адзначаў у сваіх справаздачах дырэктар музея Э.Хазін, было не зусім прыстасаваная для захоўвання калекцый музейных прадметаў (у 1979 г. фонды музея налічвалі каля 18 тысяч)[20].



*Фрагмент экспазіцыі стацыянарнай выставы "Полацк у міжваенны час. 1917—1941".* Фота 2007 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З года ў год музей разнастаіў формы работы з наведвальнікамі. Экскурсіі па экспазіцыі праводзілі не толькі супрацоўнікі, але і на грамадскіх пачатках экскурсаводы з ліку актыву музея (на іх долю прыходзілася каля трэці ўсіх экскурсій). Музей арганізоўваў дыспуты, тэматычныя вечары, сустрэчы з цікавымі людзьмі з розных куткоў Савецкага Саюза, а таксама з іншых краін (Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі і Народнай Рэспублікі Балгарыя), урокі мужнасці. Пры музеі працаваў гурток краязнаўства, у якім займаліся вучні 7-8 класаў полацкай сярэдняй школы № 5. Выязныя мерапрыемствы суправаджаліся дэманстрацыяй выстаў, некаторыя з іх арганізоўваліся сумесна з іншымі ўстановамі культуры горада. Лекцыйная работа планавалася і праводзілася сумесна з гарадскім аддзяленнем таварыства па ахове помнікаў гісторыі і культуры і няштатным бюро прапаганды, лектарамі якога з'яўляліся ўсе супрацоўнікі музея. Падчас мерапрыемстваў выкарыстоўваліся такія тэхнічныя сродкі, як кінаўстаноўка "Украіна", магнітафон, прайгравальнік. Штогод колькасць наведвальнікаў павялічвалася: у пачатку 1970-х гг. гэтая лічба складала больш за 90 тысяч чалавек у год. Супрацоўнікі музея павышалі кваліфікацыю на рэспубліканскіх курсах для работнікаў культуры ў Мінску.



*Будынак Краязнаўчага музея Полацка.* Сучаснае фота.

Калектыў краязнаўчага музея аказваў метадычную і практычную дапамогу рэгіянальным музеям і музеям прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна, гарадскому Дому культуры, навучальным установам, працоўным калектывам у стварэнні куткоў і пакояў працоўнай і баявой славы, афармленні альбомаў, стэндаў, правядзенні работы па ваенна-патрыятычным выхаванні. За разнастайнымі даведкамі ў полацкі музей звярталіся партыйныя і савецкія органы, актывісты і арганізатары з прадпрыемстваў і ўстаноў, краязнаўцы і школьнікі з усяго Савецкага Саюза.

Супрацоўнікі музея праводзілі і вялікую збіральніцкую работу: у фонды паступалі як матэрыялы археалагічных раскопак, так і выпадковыя знаходкі (як, напрыклад, скарб залатых упрыгажэнняў X ст., знойдзены на тэрыторыі гарадскога стадыёна падчас яго добраўпарадкавання ў 1984 г.), фотакопіі дакументаў з архіваў, музеяў і бібліятэк Савецкага Саюза, успаміны, асабістыя рэчы і ўзнагароды палачан (удзельнікаў рэвалюцыйных і ваенных падзей першай паловы XX ст., перадавікоў, рацыяналізатараў і г. д.), узоры прадукцыі мясцовых прадпрыемстваў горада і сяла і інш.

У 1975 г. у музеі адкрыўся абноўлены аддзел прыроды, створаны паводле архітэктурна-мастацкага рашэння ("Вясна", "Лета", "Восень", "Зіма"), ухваленага мастацкім саветам Віцебскіх мастацкіх майстэрняў.

Паводле загадаў Міністэрства культуры БССР і ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, 25 чэрвеня 1985 г. быў створаны Полацкі гісторыка-археалагічны запаведнік, у склад якога ўвайшлі ўласна гісторыка-археалагічны запаведнік як былы філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і Полацкі краязнаўчы музей на правах філіяла запаведніка[21].

У перыяд з 1986 па 1988 г. у музеі праходзіла апошняя на сённяшні дзень маштабная рээкспазіцыя, падчас правядзення якой ладзіліся зменныя выставы. Адкрыццё новай экспазіцыі Полацкага краязнаўчага музея адбылося 4 верасня 1988 г. з аддзела дасавецкай гісторыі[22], які займаў першы паверх будынка былой кірхі. Для экспазіцыі мастак Д.Х.Гліва стварыў некалькі дыярам, якія прадстаўлялі Полацк у розныя стагоддзі. У наступным годзе на другім паверсе пачаў працаваць аддзел "Гісторыя савецкага грамадства".

## Новы этап

З надыходам у 1991 г. новага перыяду ў гісторыі рэспублікі супрацоўнікі музея вымушаныя былі пераглядзець структуру асноўнай экспазіцыі, у выніку чаго была дэмантаваная экспазіцыя аддзела гісторыі савецкага часу. Вольныя плошчы былі выкарыстаныя пад зменныя выставы. Экспедыцыйная работа супрацоўнікаў музея 1980-х гг. дазволіла сабраць вялікую калекцыю этнаграфіі, на базе якой у пачатку 1990-х гг. была адкрыта экспазіцыйная зала, афармленая ў выглядзе сялянскай хаты XIX — пачатку XX ст.

Важнай вехай у сучаснай гісторыі краязнаўчага музея Полацка стала падрыхтоўка калектывам музея (В.Д.Краско, Н.А.Сяргеенка, А.В.Козел)

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

у супрацоўніцтве з мастакамі А.В.Канавалавым і А.М.Чартковым стацыянарнай выставы "Полацк у міжваенны час. 1917—1941", адкрыццё якой адбылося ў кастрычніку 2006 г. Сёння гэтая выстава, размешчаная на другім паверсе кірхі, з'яўляецца часткай асноўнай экспазіцыі музея.

У 2001 г. была праведзена першая навуковая гісторыка-краязнаўчая канферэнцыя, прысвечаная юбілею (75-годдзю Полацкага краязнаўчага музея), у рабоце якой прынялі ўдзел гісторыкі і краязнаўцы з Беларусі і Расіі. Ужо стала традыцыяй правядзенне такога кшталту канферэнцый кожныя пяць год. 7-8 снежня 2016 г. адбылася чарговая, чацвёртая па ліку, навукова-краязнаўчая канферэнцыя.

Сёння Краязнаўчы музей Полацка з'яўляецца адным з філіялаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Музей наведваюць навучэнцы школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў горада, Беларусі і замежных краін, турысты. Некалькі разоў у год музей арганізоўвае рознапланавыя выставы, якія, дапаўняючы асноўную экспазіцыю, адкрываюць наведвальнікам малавядомыя старонкі старажытнай і сучаснай гісторыі горада. На базе музея амаль штомесяц праводзяцца музейна-педагагічныя заняткі як у рамках агульнай праграмы музея-запаведніка, так і ў рамках факультатыўнага курса "Полацказнаўства", які вывучаецца ў школах горада. Штогод музей наведвае больш за 6 тысяч чалавек.

Супрацоўнікі музея актыўна займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю, па выніках якой прымаюць удзел у навуковых канферэнцыях, аказваюць метадычную і кансультацыйную дапамогу, папулярызуюць гісторыка-культурную спадчыну самага старажытнага горада Беларусі праз публікацыі ў спецыялізаваным і перыядычным друку. Традыцыйным стаў удзел супрацоўнікаў у якасці членаў журы ў краязнаўчых чытаннях навучэнцаў "Спадчына Полацкай зямлі", што праводзяцца ў горадзе апошнія дзесяць год. Прыцягваюць наведвальнікаў мерапрыемствы, якія калектыў музея арганізоўвае штогод у рамках акцыі "Ноч музеяў".

Да 90-годдзя Краязнаўчага музея Полацка навуковыя супрацоўнікі рыхтуюць адкрыццё новага раздзела экспазіцыі, прысвечанага палачанам, удастоеным пачэснага звання ганаровага грамадзяніна г. Полацка. Праз знаёмства з іх жыццём і дзейнасцю наведвальнікі адкрыюць для сябе асобныя старонкі гісторыі горада другой паловы XX — пачатку XXI ст.

---

[1] Мялешка С. Полацкі акруговы краязнаўчы музэй // Наш край. 1929, № 12. С. 55—58; Агурок П. Экскурс у мінулае Полаччыны // Сцяг комунізма. № 146 (289). 9 снежня 1955 г. С. 3; Казлёнак М. Полаччына ў XIII—XVIII стагоддзях // Сцяг комунізма. № 12 (4814). 27 студзеня 1957 г. С. 3; Купрыянаў В. Прырода ў музеі // Сцяг камунізму. № 5 (9612). 8 студзеня 1983 г. С. 3; Ёнка. Краязнаўчы музей // Полацкі веснік. № 141 (11386). 7 лістапада 1991 г. С. 2; Хановіч Г. Разнастаім формы работы // Сцяг камунізма. № 174 (7047). 4 лістапада 1970 г. С. 3.

[2] Джумантаева Т.А. Да пытання аб стварэнні краязнаўчага музея ў Полацку // Матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі: (да 75-годдзя Полацкага краязнаўчага музея). Полацк, 2001. С. 29—32; Яна ж. Краязнаўчы музей Полацка (пач. 20 ст. — 70-я гг. 20 ст.) // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 1999 г.). Полацк, 2000. С. 5—20; Краско О.Д. История Полоцкого краеведческого музея // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-доследнай работы ў 1997 г.). Полацк, 1998. С. 14—16; Сяргеенка Н. Установы культуры ў Полацку на пачатку 20-х гг. XX ст. // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: (па выніках навукова-даследчай работы ў 2004 г.). Полацк, 2005. С. 79—93; Жук Н.В. Семен Бресский — педагог, художник, первый заведующий краеведческим музеем в Полоцке // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А.Р.Брадоўскага, 22-23 кастрычніка 2009 г., Віцебск. Мінск, 2010. С. 294—300.

[3] Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку (далей — ЗДА ў г. Полацку). Ф. 54, воп. 1, спр. 232, арк. 72.

[4] Джумантаева Т.А. Да пытання аб стварэнні краязнаўчага музея ў Полацку. С. 30.

[5] Краско О.Д. История Полоцкого краеведческого музея. С. 15.

[6] Жук Н.В. Семен Бресский — педагог, художник, первый заведующий краеведческим музеем в Полоцке. С. 296.

[7] Джумантаева Т.А. Да пытання аб стварэнні краязнаўчага музея ў Полацку. С. 32.

[8] Летапіс Краязнаўчага музея // Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі да 85-годдзя Краязнаўчага музея ў г. Полацку. Полацк, 2011. С. 43.

[9] Гаўрылава С.В. Асноўныя кірункі аднаўлення і развіцця г. Полацка ў 1944—1954 гг. Частка 3. Ахова здароўя, адукацыя, культура, фізкультура і спорт // Полацкі музейны штогоднік: (зборнік навуковых артыкулаў за 2014 г.). Полацк, 2015. С. 106.

[10] В краеведческом музее // Большевистское знамя. № 48 (615). 23 декабря 1948 г. С. 2.

[11] Гаттих В. В областном краеведческом музее // Большевистское знамя. № 38 (785). 17 июня 1949 г. С. 2.

[12] Джумантаева Т.А. Краязнаўчы музей Полацка (пач. 20 ст. — 70-я гг. 20 ст.). С. 14.

[13] Летапіс Краязнаўчага музея. С. 44.

[14] Па залах Полацкага краязнаўчага музея // Сцяг комунізма. № 24 (167). 25 лютага 1955 г. С. 3.

[15] Казлёнак М. Полаччына ў XIII—XVIII стагоддзях // Сцяг комунізма. № 12 (4814). 27 студзеня 1957 г. С. 3.

[16] ЗДА ў г. Полацку. Ф. 658, воп. 1, спр. 173, арк. 116.

[17] Там жа. Арк. 126.

[18] Джумантаева Т.А. Краязнаўчы музей Полацка (пач. 20 ст. — 70-я гг. 20 ст.). С. 15.

[19] Летапіс Краязнаўчага музея. С. 44.

[20] Оживает история // Химик. № 69 (1927). 12 июня 1979 г. С. 2.

[21] ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1152, воп. 4, спр. 378, арк. 59.

[22] Летапіс Краязнаўчага музея. С. 45.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ